

УЛАДЗІМІР ЛЯХОЎСКІ

# Палескі паход генерала Станіслава Булак-Балаховіча 1920 г.: новыя крыніцы

Вайсковец, абаронца сваёй зямлі мае пашану ў любой краіне. Беларусь тут — не выключэнне. Са старажытных часоў можна ўзгадаць цэлы шэраг выбітных ваяроў-палкаводцаў, якія вызначаліся гістарычнымі перамогамі ў войнах за незалежнасць беларускага гаспадарства: князь Давыд Гарадзенскі, вялікі князь літоўскі Альгерд, Міхал Глінскі, Канстанцін Астрожскі, Юры Радзівіл, Ян Караль Хадкевіч, Тадэвуш Касцюшка... Але наступныя стагоддзі чужацкага панавання пазбавілі Беларусь уласнай вайсковай эліты. З тутэйшых маладзёнаў, што прысвяцілі сябе вайсковай службе, гадаваўся зусім іншы тып вайскоўцаў. Яны прысягалі на вернасць ужо расійскаму імператару і рабілі вайсковую кар'еру ў складзе царскага войска. У той жа час сярод вымуштраваных у расійскіх кадэцкіх корпусах, вайсковых вучэльнях і акадэміях афіцэраў, што паходзілі з Беларусі, было таксама нямала таленавітых і храбрых военачальнікаў, якія вызначаліся ў войнах, што вяла Расійская імперыя ў XIX — пачатку XX стст. Нямала з іх даслужылася да генеральскіх зорак (узгадаем хаця б генерал-фельдмаршала Іосіфа Гурко і генерал-лейтэнанта Мікалая Бжазоўскага).

Крах імперыі Раманавых прывёў да хуткай агоніі і царскага войска. Расійскі афіцэрскі корпус падчас Грамадзянскай вайны таксама раскалоўся на дзве часткі: большасць далучылася да Белага руху, але шмат хто пайшоў служыць і да бальшавікоў. Некаторая частка былых царскіх генералаў і палкоўнікаў, не рускія па нацыянальнасці, раптам успомнілі, што ў іх ёсць не абстрактная, а рэальная радзіма. Многія з іх ужо з другой паловы 1917 г. актыўна далучыліся да нацыянальных рухаў сваіх народаў. У далейшым яны шмат зрабілі па арганізацыі ўзброеных сілаў сваіх новаўтвораных дзяржаў: Алі-Ага Шыхлінскі (Азербайджан), Георгій Квінітадзэ

(Грузія), Карліс Гопер (Латвія), браты Канстанцін і Юзаф Доўбар-Мусніцкія (Польшча), Фёдар Калодзій і Уладзімір Сінклер (Украіна), Карл Густаў Манергейм (Фінляндыя), Аляксандр Тынісан (Эстонія). Многім з іх з маральнага боку было не так проста адмовіцца ад сваёй ранейшай прысягі. Але захаваная з дзяцінства і юнацтва духоўная повязь са сваёй радзімай і канстатацыя пагібелі царскай Расіі падштурхнулі іх зрабіць такі выбар, звязаўшы свой лёс з самастойным нацыянальна-дзяржаўным будаўніцтвам на радзіме.

Разгорнуты пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. сярод «іншародцаў» рух за стварэнне свайго нацыянальнага войска закрануў і беларусаў. Ён ахапіў тады ўсе франты Першай сусветнай вайны і Балтыйскі флот. Разгон бальшавікамі Усебеларускага з’езда ў снежні 1917 г. і пазнейшыя рэпрэсіі супраць сяброў Цэнтральнай беларускай вайсковай рады не дазволілі сфармаваць Менскі беларускі полк. Беларусізацыя 4-га армейскага корпуса, якая пачалася ў пачатку 1918 г. на Румынскім фронце, «рассыпалася» з-за абвешчанай ленінскім урадам дэмабілізацыі старога царскага войска. Пры БНР у снежні 1918 г., напрыканцы кайзераўскай акупацыі Мінска, аказаліся марнымі высілкі беларускіх дзеячаў арганізаваць для адпору бальшавікоў не толькі дзеяздольныя вайсковыя часткі, але нават і міліцэйскія (муніцыпальныя) аддзелы для падтрымання правапарадку.

Таксама не ўдалося захаваць арганізаваны ў канцы 1918 г. на сродкі Рады краёвай абароны Літоўскай Рэспублікі Першы беларускі полк у Горадні. З прыходам у горад у красавіку 1919 г. польскіх легіянераў апошні быў



**Уладзімір Ляхоўскі** — гісторык, сталы аўтар «ARCHE». Апошняя публікацыя на старонках часопіса – «Прэса і выдавецтвы БНР (1918—1925 г.)» (у суаўтарстве з Андрэем Чарнякевічам (№ 1 (160) – 2019).

расфармаваны і раззброены, а большасць ягонага каманднага складу падалася ў Ковенскую Літву, дзе ўлілася ў склад беларускага батальёна, які ваяваў на баку літоўцаў у 1919–1921 гадах. Поўным правалам скончылася таксама спроба «ўзброіць» БНР з дапамогай былых ваеннапалонных царскай арміі, што ўтрымліваліся ў нямецкіх і аўстрыйскіх лагерах. Не надта выніковай аказалася праца і Беларускай вайсковай камісіі (БВК), утворанай у жніўні 1919 г. паводле загада Начальніка Польскай дзяржавы Юзафа Пілсудскага. Гэтая структура, падкантрольная палякам, так і не здолела ўтварыць хоць бы адзін дзеяздольны беларускі полк і ў 1921 г. была расфармаваная. Апошнім рэхам арганізаванага беларускага вайсковага супраціву стала Слуцкае антыбальшавіцкае выступленне 1920 г. На працягу амаль двух месяцаў дрэнна ўзброеная 1-я Слуцкая брыгада БНР ваявала супраць рэгулярных чырвоных войскаў, выкарыстоўваючы партызанскія метады супраціву. Але ў канцы снежня 1920 г. случакі вымушаныя былі перайсці дэмаркацыйную лінію, дзе былі раззброеныя і інтэрнаваныя палякамі.

Аналізуючы згаданыя факты, звязаныя з няўдалымі спробамі па стварэнні беларускага войска ў 1918–1920 гадах, можна назваць асноўныя прычыны гэтых няўдач. Па-першае, абвешчаная БНР не стала паўнавартаснай дзяржавай. Гэтае палітычнае ўтварэнне не мела належных рэсурсаў для фармавання сваіх узброеных сілаў. Па-другое, арганізацыя беларускага войска аказалася немагчымай ва ўмовах перманентнай акупацыі краю і з-за адсутнасці належнай кансалідацыі беларускага грамадства. Абвешчаныя лозунгі аб незалежнасці Беларусі, заклікі запісвацца ў беларускае войска не знайшлі шырокай падтрымкі ў тутэйшага насельніцтва. Узнятая планка нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва і справа стварэння ўзброеных сілаў БНР не адпавядалі тагачасным арганізацыйным, людскім і матэрыяльным магчымасцям беларускага нацыянальнага руху. Па-трэцяе, няўдача ў фармаванні нацыянальнага войска таксама была звязана з адсутнасцю нацыянальна арыентаванай вайсковай эліты.

Абсалютная большасць вышэйшага афіцэрскага складу, што паходзіла з Беларусі, аказалася глухой да заклікаў беларускіх арганізацый запісвацца ў нацыянальнае войска. «Па закліку сэрца» апошнія ішлі ваяваць на баку Белага руху або вымушаныя былі служыць бальшавікам. Асобныя вайскоўцы, што паходзілі з тутэйшай спаланізаванай шляхты, падаліся ў польскае войска. Былі і такія, што ваявалі ў складзе былых Паўднёва-Заходняга і Румынскіх франтоў, а потым перайшлі на службу ўкраінскай дзяржаве. Беларусы-генералы, якія мелі сантымент да БНР (Канстанцін Алексіеўскі, Павел Вэнт, Кіпрыян Кандратовіч, Мікалай Караткевіч, Алег Корсак-Васількоўскі, Іосіф Пажарскі) без належных рэсурсаў і палітычнай падтрымкі фактычна аказаліся камандзірамі без войска.

Але вылучаецца адзін вайсковец, які за кароткі час прайшоў шлях ад шарагоўца да генерала, а ў канцы 1919 г. пагадзіўся перайсці са сваім аддзелам на бок БНР і ваяваць за незалежнасць Беларусі. Гаворка ідзе пра Станіслава Булак-Балаховіча (1883–1940), ураджэнца Браслаўшчыны, вайсковая кар’ера якога была звязана з трагічнымі перыпетыямі гісторыі Расіі, Беларусі, Польшчы і краін Балтыі. Ён паспеў паслужыць у чырвоных і белых, а таксама ў складзе польскага войска, дзе даслужыўся да брыгаднага генерала. ▸▸

На сёння пра генерала і яго паплечнікаў напісана ўжо няма-ла. Баявыя дзеянні балахоўцаў падчас Палескага пахода 1920 г. адлюстраваныя таксама ў апублікаваных архіўных дакументах і ўспамінах, пачатак якім быў закладзены яшчэ сучаснікамі Булак-Балаховіча — Барысам Савінкавым, атаманам Іскрай (І. Лахвіцкім), камандзірамі асобных чырвоных дывізій, што ваявалі супраць балахоўцаў пад Мазыром, Калінкавічамі і Рэчыцай.

Прааналізаваўшы ўсё напісанае пра С. Булак-Балаховіча, можна адзначыць, што многія публікацыі пра атамана маюць розную навуковую вартасць, ступень аб'ектыўнасці і ідэалагічную скіраванасць. У савецкі час пра «бацьку» Балаховіча і яго войска можна было пісаць толькі ў рэзка негатыўным кантэксце: як пра бандыта, злачынца, пагромшчыка і лютага ворага савецкай улады. З часоў перабудовы склаўся іншы вобраз атамана — рамантычны і нават высакародны. Тут мы бачым Булак-Балаховіча найперш «беларускім патрыётам», які «са зброяй у руках змагаўся за рэальнае ўвасабленне палітычнай незалежнасці Беларусі». Апагеем гэтага рамантычнага вобразу стаў зняты ў 2009 г. рэжысёрам Сяргеем Ісакавым па замове тэлеканала «Белсат» дакументальны фільм «Генерал няскончанай вайны». Сёння можна сцвярджаць, што постаць генерала абрасла мноствам міфаў, якія маюць малое дачыненне да гістарычнай праўды.

Цяперашні высокі рэйтынг папулярнасці Станіслава Булак-Балаховіча сярод патрыятычна арыентаванай моладзі, якой абрыдла прасавецкая інтэрпрэтацыя айчыннай гісторыі, можна растлумачыць пошукамі свайго сапраўднага героя-вайскоўца ў найноўшай гісторыі Беларусі, не звязанага з савецкай традыцыяй. Іншы бок гэтых пошукаў — масавы зварот моладзі да альтэрнатыўных гістарычных інтэрпрэтацый у недзяржаўных сродках інфармацыі і інтэрнэт-рэсурсах, дзе «нераспрацаванае мінулае» мае іншае ідэалагічнае гучанне і ацэнку, чым ў так званым «афіцыёзе». Гэтыя нярэдка сумнеўныя і аматарскія інтэрпрэтацыі перакрываюць сабой сур'ёзныя навуковыя даследаванні па дадзенай тэме і запаўняюць прабелы ў гістарычнай свядомасці маладых беларусаў рознымі небыліцамі. Падобнае «асветніцтва» не заўсёды мае пазітыўныя вынікі, а часам і наўпрост шкодзіць фармаванню аб'ектыўнага погляду на нашу гісторыю.


Жаўнеры Беларускай асобнай роты ў літоўскай арміі.

Факт, што Станіслаў Булак-Балаховіч ваяваў супраць бальшавікоў, ніхто не аспрэчвае. Але пад чыім сцягам і ў імя чаго змагаўся гэты генерал? Ягоная адданасць беларускай нацыянальнай ідэі выклікае ў многіх даследчыкаў вялікія сумненні, а тыя сродкі, што выкарыстоўваліся ім і ягонымі падначаленымі дзеля дасягнення сваіх мэтаў, таксама з'яўляюцца прадметам гарачых спрэчак.

Публікаваныя тут упершыню ўспаміны блізкіх паплечнікаў Булак-Балаховіча палкоўніка Паўла Алейнікава і генерала Міхаіла Яраслаўцава маюць высокую дакументальную і археаграфічную каштоўнасць. Калісьці яны захоўваліся ў «Калекцыі матэрыялаў па гісторыі эміграцыі» былога Рускага замежнага архіва ў Празе, а ў 1947 г. апынуліся ў зборах Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі. І толькі цяпер яны публікуюцца, каб стаць даступнымі шырокай грамадскасці.

Гістарычная вартасць гэтых новых сведчанняў якраз у тым, што ў іх адлюстроўваюцца постаці генерала і яго найбліжэйшых паплечнікаў, дастаткова падрабязна выкладаецца ўвесь ход падзей падчас Палескага пахода 1920 г. Гэта не апалагетычныя рэфлексіі прыхільнікаў генерала накшталт успамінаў «На абарону Бацькаўшчыны» змешчаных у 1921 г. у паланафільскай газеце «Jednaść» пад крыптанімам «А. К.» (яны прыпісваюцца вядомаму беларускаму пісьменніку Ядвігіну Ш., хоць гэта, на нашу думку, не бясспрэчна), не вонкавыя ўражанні поль-

скіх афіцэраў, прыкамандзіраваных да войска атамана, а таксама не стракатыя, «бесфактурныя» ідэалагізаваныя зацемкі чырвонаармейскіх камандзіраў, што ваявалі супраць балахоўцаў. Гэта позірк з сярэдзіны — успаміны людзей, якія непасрэдна ўваходзілі ў кіраўніцтва Народнай добраахвотніцкай арміяй (НДА) і валодалі эксклюзіўнай інфармацыяй, звязанай з падрыхтоўкай і ажыццяўленнем Палескага пахода. Яны раскрываюць тую палітычную і маральную атмасферу, якая панавала сярод шарагоўцаў і афіцэраў розных вайсковых аддзелаў балахоўскай арміі.

Найбольш інфарматыўнымі і каштоўнымі з'яўляюцца мемуары выканаўцы абавязкаў генерал-кватэрмайстра НДА, палкоўніка Паўла Алейнікава. Іх назва — «Два месяцы ў войску С. Булак-Балаховіча» — аўтарская. У арыгінале ўспаміны рукапісныя, выкананыя на 95-ці не змацаваных паміж сабой — таму некаторыя пагубіліся — аркушах канцылярскай пажоўклай ад часу паперы. Іх архіўны шыфр: Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі, ф. 5881, воп. 2, спр. 545, арк. 1—107.

Тут згадваюцца раней невядомыя факты, якія развейваюць многія ранейшыя стэрэатыпы і міфы, звязаныя з «Бацькам» і ягонымі «сынкамі». У адным абразку, напісаным ярка і красамоўна, добра паказана сапраўднае стаўленне С. Булак-Балаховіча да беларускага пытання і да ідэі незалежнасці Беларусі, — т. зв. «альфы і амегі» ўсяго палескага ваеннага паходу, як іранічна акрэсліў сам Алейнікаў. Рашэнні і дзеянні Булак-Балаховіча па беларускім пытанні былі ў цэлым узгодненыя з Барысам Савінкавым і выкарыстоўваліся ў якасці палітычнай «дымавой» завесы пры стварэнні плацдарма для далейшага наступлення на Маскву («7 лістапада 1920 г. у Тураве была абвешчана незалежнасць Беларусі, але ўсё беларускае пытанне насіла выразны тэатральны характар»).

Ва ўспамінах П. Алейнікава таксама развенчваецца «качка», якая і дагэтуль гуляе па старонках аматарскай літаратуры і інтэрнэта, звязаная са «стварэннем» пры балахоўскім войску т. зв. «габрэйскага эскадрона» пад камандаваннем Цэйтліна. Алейнікаў успамінаў: «Калі армія была вымушаная пакінуць польскую тэрыторыю, то ніхто з мясцовых габрэяў у паход не выступаў і ў мястэчка Тураў прыбылі толькі сам прапаршчык Цэйтлін з загадчыкам гаспадаркі дружыны (рускім)». Пазней жа Цэйтлін у размове з завербаваным польскай дэфензівай габрэем нібыта неасцярожна выказаўся, што «ўжо Урангель разбіты, наша сволач таксама бяжыць, і я буду па-вар'яцку шчаслівы, калі мы будзем страляць ім у спіну».

Мемуары П. Алейнікава аздобленыя каштоўнымі дакументальнымі дадаткамі, што складаюцца з афіцыйных дакументаў і загадаў генерала, ягоных тэлеграм да Ю. Пілсудскага і Б. Савінкава, зваротаў да сваіх вайскоўцаў і мясцовага насельніцтва.

Успаміны М. Яраслаўцава напісаныя чалавекам «рускага свету», цвёрдым прыхільнікам «адзінай і недзялімай». Але яны таксама маюць высокую інфармацыйную вартасць. Як і мемуары Алейнікава, рэфлексіі былога царскага генерала можна выкарыстоўваць у якасці ацэнкі дасведчанага вайсковага эксперта рашэнняў, зробленых камандаваннем НДА пры правядзенні Палескай ваеннай аперацыі. У арыгінале яны набраныя на машынцы, архіўны шыфр: Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі, ф. 5881, воп. 1, спр. 577, арк. 1–32.

Мемуары П. Алейнікава і М. Яраслаўцава даюць шмат інфармацыі пра стан вайсковай дысцыпліны і маральнага духу ў балахоўскім войску. Яны не хаваюць фактаў антысеміцкіх настрояў і паводзін сярод афіцэраў і жаўнераў НДА, якія выліваліся ў пагромы і рабаванні мясцовых габрэяў. Суровыя загады С. Булак-Балаховіча па пакаранні пагромшчыкаў не змаглі спыніць гвалту і анархіі ў ягоным войску. «Булак-Балаховіч, — пісаў М. Яраслаўцаў, — быў адважным, таленавітым камандзірам, якога вельмі шанавалі ягоныя сынкі-партызаны, але справіцца са сваім свавольным асяроддзем ён быў не ў сілах і яно яму стварала дурную славу». Гэтым падкрэсліваецца палітычная адказнасць камандуючага НДА за бясчынствы сваіх падначаленых.

Адмыслова яшчэ раз адзначым, што гэтыя дакументальныя матэрыялы друкуюцца ўпершыню. Раней яны не былі шырока даступныя беларускім даследчыкам. У рэдкіх выпадках на іх ёсць спасылкі асобных расійскіх аўтараў (Дзяніса Аляксеева, Ігара Лашкарова і некаторых іншых). Таму спадзяемся, што публікаваныя тут матэрыялы прыдадуцца для запаўнення новых незапоўненых элементаў у карціне, што адлюструе постаць генерала Станіслава Булак-Балаховіча і ягоныя ўчынкі.

Увогуле аўтар гэтых радкоў не прыхільнік крайніх пазіцый у ацэнцы палітычнага і чалавечага крэда Станіслава Булак-Балаховіча. Ён не д'ябал і не анёл, ён прадукт свайго часу, народжанага ваеннымі падзеямі, рэвалюцыяй і сацыяльным хаосам. Якой жа эпітафіі заслугоўвае «генерал няскончанай вайны» па выніках свайго зямнога быцця? Думаецца, як і ўсе мы: «Бог ведае ўсё...».

І ўспаміны Паўла Алейнікава, і мемуары Міхаіла Яраслаўцава друкуюцца на мове арыгінала ў сучаснай арфаграфіі. Аўтар публікацыі выказвае шчырую падзяку за дапамогу ў падрыхтоўцы матэрыялаў аднаму з кіраўнікоў беларускай дыяспары ў Маскве Андрэю Макагону, а таксама Вользе Півоньскай — за электронную апрацоўку апублікаваных тут схемаў і картаў. ■